А. Г. КАВАЛЕНЯ

# ПАЧАТАК ГІСТОРЫКА-ЭТНАГРАФІЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ ГОРАДА: НА ПРЫКЛАДЗЕ «OPISANIE POWIATU BORYSOWSKIEGO…» Я. ТЫШКЕВІЧА / ISTORINĘ IR ETNOGRAFINĘ MIESTO TYRIMUS: DĖL PAVYZDYS «OPISANIE POWIATU BORYSOWSKIEGO...» E. TIŠKEVIČIAUS

A. KAVALENYA

# THE BEGINING OF HISTORICAL AND ETHNOGRAPHIC URBAN STUDIES ON THE EXAMPLE OF «OPISANIE POWIATU BORYSOWSKIEGO…» Y. TYSHKEVICH

*The author of the article indicates that the monograph by Y. Tyshkevich is one of the first patterns for outlook of the city in the 19th century. The description based on statistical and archival documents on ethnography, folklore, toponymy, and linguistics. The monograph «The Discription of the Borisov Povet» by Y. Tyshkevich was the basis for complex analysis the Barysau city, its history, development, the description of the style, traditions, occupations of the citizens. This approach requires an understanding of the relationship of the processes occurring in the city, society and culture.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У XIX ст. у Беларусі прыкметна актывізавалася дзейнасць па вывучэнні духоўнай і матэрыяльнай культуры пэўных рэгіёнаў края. У гэты час, 1817 г., у Варшаве друкуецца праца Яўстаха Тышкевіча, прысвечаная гісторыі і этнаграфіі Барысава і Барысаўскага павета «Opisanie powiatu Borysowskiego…». Над кнігай таксама працавалі Канстанцін Буліч, Язэп Багдановіч, Язэп Бяліцкі, рэдактар і публіцыст Антон Марціноўскі, літограф і ілюстратар Язэп Азямблоўскі, археолаг, які склаў статыстычнае апісанне павета, Леў Пятроўскі [2]. Пры гэтым К. Тышкевіч у лісце да Плацыда Янкоўскага падкрэсліваў, што асноўным аўтарам кнігі быў яго брат: «Брат Яўстах напісаў для статыстычнага камітэта гісторыю горада і цэлага Барысаўскага павета, якая хутка павінна з’явіцца ў друку» [1, с. 47].

Большасць старажытных гарадоў Беларусі будавалася дзеля бяспекі і абароны паселішчаў, у сувязі з гэтым яны мелі гарадскія ўмацаванні, крэпасці і замкі. «Пачатак гісторыі гарадоў амаль заўсёды аднолькавы, – адзначаў Я. Тышкевіч. – Спачатку гэта былі маленькія крэпасці, абведзеныя валамі і каналамі, у якіх жылі людзі і якія ахоўвалі іх ад нападу мацнейшых ворагаў. Па меры павелічэння колькасці жыхароў селішчы пашыраліся і

ператвараліся ў гарады» [3, с. 120]. У сёняшнім успрыманні паняцце «горад» – гэта сацыяльна прыстасаваная частка прыроднай прасторы, з жыццёвай прасторай чалавека і прасторай культуры. У гэтай шматузроўневай структуры кожны чалавек мае сваё ўспрыманне горада.

Малы горад раней можна было ўвесь аглядзець з якой-небудзь адной кропкі. Уражанне доўга захоўвалася ў памяці як шчымлівы напамін. Я. Тышкевіч апісваў Барысаў так: «З поўначы горад закрывае ўзгорак. З усходу блізка растуць лясы, якія робяць яго нябачным здалёк. Толькі з поўдня, з вышыні Мінскага гасцінца, на яго адкрываецца выдатны від. Прыезджы бачыць перад сабой стуленае драўлянае мястэчка, якое бялее дымавымі трубамі і каменным касцёлам» [3, с. 29].

Раздзел кнігі «Гістарычныя звесткі» прысвечаны гістарычнай даведцы аб горадзе і павеце, яго геаграфічнаму становішчу, клімату. «Барысаў, павятовы горад Мінскай губерні, які знаходзіцца ў 10,5 мілях ад Мінску, на 53° 14', 46" паўночнай шыраты, 46°, 16' і 14" геаграфічнай даўжыні» [3, с. 29]. Таксама прыводзяцца статыстычныя даныя, якія характарызавалі жыхароў, гарадскія даходы, пабудовы.

Наконт першага летапіснага ўпамінання Барысава згоды паміж гісторыкамі не было. Я. Тышкевіч прыводзіць у кнізе розныя погляды. Цытуе М. Стрыйкоўскага, першага гісторыёграфа ВКЛ: «Барыс Гінвілавіч, полацкі князь, адзначыў сваю мяжу каменем, пакладзеным у раку Дзвіну». На ім быў надпіс: «Вырашыў знакам узмацніць межы паміж Літвой і Полацкім княствам». І пабудаваў замак і горад на рацэ Бярэзіне ад свайго імя і назваў яго Барысавам [3, с. 33]. Існавалі і іншыя версіі пра паходжанне горада. Некаторыя даследчыкі лічылі, што ён мог быць заснаваны ў 1102 г. Барысам Усяславічам, старэйшым сынам легендарнага князя Усяслава Брачыславіча па мянушцы Чарадзей. Тышкевіч пагадзіўся з летапісцамі, што ўпершыню Барысаў згадваецца ў старажытнарускім Лаўрэнцьеўскім летапісе пад 1128 г., дзе гаворыцца пра паход дружыны чарнігаўскага князя ў Полацкую зямлю «на крывічоў» [3, с. 35].

Умацаванне знешніх гандлёвых сувязей спрыяла росту і росквіту гарадоў. Галоўным фактарам у час выбару месца для будаўніцтва Барысава стала зручнае геаграфічнае становішча: Бярэзіна з’яўлялася адгалінаваннем воднага шляху «з вараг у грэкі», злучала Балтыйскае і Чорнае моры. Акрамя таго, побач праходзілі дарога з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кіеўскай Русі ў Полацкае княства крывічоў і паўночная мяжа з Тураўскім княствам дрыгавічоў. Па словах Я. Тышкевіча, «Барысаў, як пагранічны горад дзвюх дзяржаў, ніколі асобнага быту ані жыцця не меў: служыў толькі шчытом то аднаму, то другому. Як горад пагранічны, замацаваны на дарозе, быў сведкам вайсковых дзеянняў, не раз быў полем бітваў і месцам знаходжання войска князёў і каралёў» [3, с. 36].

Апісваючы Барысаў, Тышкевіч адзначаў, што ён быў стандартным павятовым горадам тых часоў: умацаваны дзяцінец-град, вакол якога знаходзіўся гандлёва-рамесны пасад. Стратэгічнае месцаванне Барысава, што стаяў на скрыжаванні сухапутнага і воднага шляхоў, абумовіла яго далейшы лёс. «Уздоўж правага берага ракі бялее ад ветразей гандлёвая прыстань. Часцей прыстань запоўнена байдакамі і людзьмі, якія выносяць з судна тавары для пакупнікоў» [3, с. 29]. Багацці Барысаўскай пушчы і прыстань на Бярэзіне спрыялі таму, што Барысаў увайшоў у лік передавых гандлёвых гарадоў Беларусі па аб'ёме грузаабароту і аптовых угодзяў лесу, хлеба, солі, ільну.

Горад неаднаразова спусташаўся ў часы іншаземных нашэсцяў і ўнутраных звадак. Але ён адраджаўся, і мірнае жыццё працягвала ісці сваім парадкам. У XVI ст. Барысаў быў параўнальна людным горадам: налічваў 2–2,5 тыс. жыхароў (больш траціны ад усяго насельніцтва воласці).

Асноўныя тэндэнцыі развіцця гарадоў Заходняй Еўропы (магдэбургскае права, цэхі) знайшлі сваё месца і ў гісторыі г. Барысава. У 1563 г. Барысаўская воласць была ператворана ў Барысаўскае староства. На працягу двух з паловай стагоддзяў пасаду барысаўскага старосты займалі прадстаўнікі самых шляхетных і ўплывовых магнацкіх родаў: Радзівілы, Агінскія, Сапегі, Служкі, Хадкевічы. «Барысаўскі замак у позния гады не для абароны горада служыў, а пераходзіў у рукі старостаў і служыў месцам іх часовага пражывання і месцавання адміністрацыі» [3, с. 55].

Хвалі міграцыі каралёў, князёў, старостаў і простых людзей уплывалі на жыццё гараджан, іх традыцыйныя заняткі, навыкі, рамёствы. Гістарычная памяць месца ўлучае тое, што людзі помняць і шануюць. У канцы XIV – пачатку XV ст. Барысаў і воласць належалі вялікаму князю літоўскаму Вітаўту. З імем гэтага князя звязваюць будаўніцтва так званых «вітавак» – іх рэшткі ў наваколлі горада захоўваюцца і дагэтуль. Аўтар паведамляе, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падчас вандроўкі па багністай, лясамі зарослай краіне князь быў вымушаны для сябе і свайго войска дарогі насыпаць, якія сёння народ заве «вітальдавымі» [3, с. 37].

Барысаў у часы Тышкевіча тыповы правінцыяльны з рынкам, прыватнымі дамамі, касцёлам, праваслаўным храмам і сінагогамі. Кожная з 12 вуліц мела сваю гісторыю, традыцыі, асаблівасці. Мінская, Маскоўская, Віленская, Лепельская, Полацкая атрымалі свае назвы ад гарадоў, у напрамку да якіх яны доўжацца. Таксама былі вуліцы для служак касцёлу, вуліца, на якой знаходзіўся млын, вуліца, па якой ішлі шведы і г.д.

Праца Я. Тышкевіча ўтрымлівае каштоўныя звесткі аб сацыякультурным жыцці горада Барысава. Людзі, як частка культурных рэсурсаў, фарміруюць імідж горада і выклікаюць у прыезджых асацыяцыі з дадзеным месцам. Культура выяўляецца ў паводзінах гараджан, традыцыях, талентах і ўменнях, у створаных імі архітэктурных і горадабудаўнічых формах. На думку аўтара, «мяшчане тутэйшыя не высокія і не нізкія: з добрымі фігурамі, здаровыя, але ленаватыя да працы, не клапоцяцца пра захаванне сваёй уласнасці, у справах нескрупулёзныя. Прычына таму – вялікая колькасць заможных габрэяў. Мова, звычаі і абрады ва ўсім павеце аднолькавыя» [3, с. 115].

Стыль горада выяўляецца ў адзенні жыхароў як сродку камунікавання. «Убор мяшчан сціплы. Крой вопраткі мужчын і кабет падобны: нешырокі, з запахам да калена кажух пад пас зімой; улетку простая шэрая цёмная кашуля з сукна, з маленькім кантам замест каўняра. Рэдка на нагах скураныя боты, часцей – простыя плеценыя лапці з ліпы, вяза, лазы з папружкай вакол нагі» [3, с. 116–117]. У цэлым, як адзначаў Я. Тышкевіч, крой вопраткі і матэрыял падобныя на ўборы мяшчан Рэчы Паспалітай.

Асноўнай рысай насельніцтва Барысава былі габрэі, якія трымалі ў сваіх руках гандаль, былі добрымі краўцамі, апранаді ўвесь Барысаўскі павет і навязвалі свой густ мяшчанам. «Усё, у чым мае патрэбу мешчанін Барысава, ён змушаны набываць у габрэяў, якія запаўняюць вуліцы і большую частку хат, займаюцца гандлем, рамёствамі, промысламі» [3, с. 112]. Я. Тышкевіч лічыў, што жыхары Барысава з-за сваёй ляноты не выкарыстоўвалі ўсе магчымасці вядзення гаспадарчай дзейнасці ў горадзе. Аўтар пісаў, што «мяшчане Барысава добрыя кавалі, шаўцы, а часцей – умелыя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдатныя рыбакі, але ім не хапае адзінства і досведу, каб забраць у свае рукі гандлёвую прамысловасць» [3, с. 112].

Абмалёўваючы каларыт горада, даследчык заключае, што духоўнае жыццё мяшчан суадносілася з матэрыяльным. Беднасць краю, безумоўна, адбівалася на ўзроўні духоўных запатрабаванняў жыхароў, якія з пакалення ў пакаленне ўшаноўвалі памяць продкаў, іх духоўны скарб. Гэтыя выпрацаваныя стагоддзямі каштоўнасці фарміравалі ўклад жыцця ўсяго павета. «Барысаў заснаваны ў даўнія часы, але да сённяшняга дня не склаў цікавых фальклорных узораў: замак, пабудаваны для абароны, не натхніў жыхароў; ніхто з іх не знайшоў прадмета для аповесці, не склаў песню, гімн» [3, с. 119]. Аўтар со шкадаваннем адзначае, што Барысаўскі павет не мае сваіх мясцовых легендаў, волатаўскіх песень ці балад, а жыхары расказваюць найбольш байкі, небыліцы.

Асноўныя заняткі гараджан былі звязаны з земляробчай працай. Я. Тышкевіч адзін з першых у беларускай фалькларыстыцы і этнаграфіі даў на прыкладзе Барысаўскага павета ўвесь гаспадарча-гадавы каляндар земляроба. З дасведчанасцю этнографа аўтар падрабязна апісваў апрацоўку лёну, уборку і захаванне гародніны (буракоў, капусты, агуркоў, рэпы, бручкі, цыбулі, морквы і інш.), да прыкладу: «Агуркі соляць у бочках рознымі спосабамі з кропам, дубовым, вішнёвым, лаўровым лісцем. Пасля асмаленыя бочкі шчыльна закрываюць і апускаюць у ваду» [3, с. 190]. Цэлы раздзел кнігі прысвечаны апісанню гародніны і іншых раслін, якія змешчаны ў кнізе ў алфавітным парадку.

Праца Я. Тышкевіча «Opisanie powiatu Borysowskiego…» была высока ацэнена суайчыннікамі. І сёння яна ўспрымаецца як выдатны набытак беларускай даследчыцкай думкі XIX ст., як пачатак комплекснага гісторыка-этнаграфічнага апісання горада.

1. *Грицкевич, В. П.* История музеев мира: учеб. пособие для студ. ист. фак. / В. П. Грицкевич, А. А. Гужаловский. – Минск : БГУ, 2004. – 282 с.

2. *Каханоўскі, Г. А.* Руплівец нашай старасветчыны : Яўстах Тышкевіч / Г. А. Каханоўскі, А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 63 с.

3. *Tyszkiewicz, Hr. Eustachy.* Opisanie powiatu Borysowskiego pod względem statystycznym, gospodarczym, premysłowo-handlowym / E.Tyszkiewicz. – Wilno : Drukarnia Ant. Marcinowskiego, 1847. – 524 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ